

1.



2.

# Пяшчотная нечысць

## «Магія графікі» Валерыя Славука ў Нацыянальнай бібліятэцы

**Выстава прысвечана 75-годдзю з дня нараджэння Валерыя Славука, знакамітага ілюстратара, удзельніка шматлікіх выставачных праектаў у Беларусі і замежжы. Сусветна вядомы графік узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2010), ён дыпламант 1 ступені Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» (Масква, 2009), пераможца ў намінацыі «Лепшы майстар» Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі — 2008», лаўрэат прэміі «Лепшы ілюстратар года» (2008)...**

**Вікторыя Харытонава**

Славук – аўтар сотняў візуальных увасабленняў беларускіх і замежных фальклорных персанажаў, разнастайных фантастычных сюжэтаў. Містычныя вобразы яго герояў зачароўваюць не адно пакаленне дзяцей і бацькоў. Кожная яго кампазіцыя – выяўленчы твор з характэрнымі аўтарскімі вынаходкамі, містычным гучаннем, прапісанымі да дробязей персанажамі і іх навакольным светам.

На выставе «Магія графікі» Валерыя Славука прадстаўлены казачныя вобразы славянскай і беларускай міфалогіі – улюбёнай тэмы мастака. Сярод работ – харызматычныя, фантастычныя аўтарскія стварэнні, каты, казюркі, рамантычныя і лагодныя сюжэты. Таксама – ілюстрацыі да казак «Скарб», «Вешчы сон», «Каралевіч і яго дзядзька», «Сіўка-бурка», «Залаты птах» і інш. Значная частка экспазіцыі – арыгіналы ілюстрацый да казачных гісторый маладой сучаснай беларускай пісьменніцы Ясеніі Сцяпанавай: «Безыменная кветка», «Плытагоны», «Купалінка»... Тут жа дэманструюцца артыкулы пра мастака, каталогі і альбомы яго твораў, ілюстраваныя Валерыем Пятровічам выданні з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: «Айвенга» Вальтэра Скота, «Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Яна Баршчэўскага, кніга казак «Чароўны свет», энцыклапедычнае выданне «Беларускі фальклор».

Непаўторны почырк майстра выяўляецца ў ювелірнай дакладнасці мноства дэталяў, характарнасці, насычаным дробязямі фоне падзей, выверанасці і рытмічнасці ліній, кампазіцыйнай гармоніі, дынамічнасці сюжэтаў. Прыёмы акадэмічнага малюнка мастак выкарыстоўвае для перадачы парадаксальнага, няўлоўнага, алегарычнага свету міфалогіі. Чараўнікі, дамавікі, волаты, русалкі, вадзянікі, ведзьмы, створаныя ўяўленнем майстра, выглядаюць не менш рэальнымі, чым суровы дзед, вясёлая дзяўчына, шчырая матуля і смелы хлопец. Фантастычны, але такі рэальны свет у работах Валерыя Славука таямніча прыцягвае. Персанажы выклікаюць захапленне і ўсмешку. Смеласць парадаксальных сюжэтаў вабіць. Адмоўныя героі выглядаюць настолькі жывымі, быццам увасобленыя высновы пра жыццё, нібы вобразнае меркаванне ўважлівага назіральніка за штодзённасцю.

Суровы твар старога казачніка, мітуслівыя феі, адважная постаць волата, пяшчотны вобраз берагіні, вясёлыя нячысцікі, змярцвелая бледная русалка, чарапы, гушчары, таямнічыя прыцемкі падвалаў замкаў, аднарогі, змрочныя беларускія балоты – магія, гумар, іронія напаўняюць і кніжную, і станковую графіку майстра, зачароўваюць атмасфернасцю. Вядзьмарства, містыка, фантастыка ўваходзяць у наша жыццё са старонак кніг, ілюстраваных Валерыем Славуком, з яго афортаў, аглушаюць, гіпнатызуюць, руйнуюць звыклую рэальнасць і дапамагаюць сабраць яе наноў – даволі паганскай і вельмі беларускай.



1. Гульня ў шары. Афорт. 2009.
2. Ілюстрацыі да казкі Ясеніі Сцяпанавай «Безыменная кветка». Папера, туш, пяро, аловак, акварэль. 2014.
3. Ілюстрацыі да казкі Ясеніі Сцяпанавай «Купалінка». Папера, туш, пяро, аловак, акварэль, 2009.
4. Ілюстрацыі да казкі Ясеніі Сцяпанавай «Плытагоны». Папера, туш, пяро, аловак, акварэль. 2014.



4.

3.

